# *ТЕОРИЯ И ИСТОРИЯ ГОСУДАРСТВА И ПРАВА*

**УДК 343.1/94(476)**

## СУЧАСНЫЯ ПАЛІТЫКА-ПРАВАВЫЯ АЦЭНКІ КРЭЎСКАЙ УНІІ 1385 ГОДА

***(д-р гіст. навук, праф. І.А. БАСЮК)***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***

*Адзначана, што Крэўская унія мае глабальнае значэнне ў гісторыі дзяржаўнасці Беларусі, яна паклала пачатак новаму этапу ў развіцці дзяржаўных сувязей Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай – этапу персанальных дынастыйных уній, які доўжыўся да Люблінскай уніі 1569 года. Даецца палітыка-прававы аналіз Крэўскай уніі, даследуюцца прычыны яе заключэння і наступствы. Аналізуюцца ацэнкі беларускіх, польскіх і літоўскіх даследчыкаў прававога становішча вялікага князя па ўмовах уніі. Разглядаюцца два магчымыя вектары гістарычнага развіцця Вялікага Княства Літоўскага – заходні (саюз з Польшчай) і ўсходні (саюз з Масквой), паказаны акалічнасці выбару Ягайлам заходняга вектара развіцця Княства. Паказана безгрунтоўнасць сцвярджэнняў крыжакоў аб рэлігійных матывах іх паходаў на Літву. Адзначана, што Крэўская унія аб'ектыўна была выгадна не толькі Вялікаму Княству Літоўскаму і Польшчы, але і народам Усходняй Еўропы, бо аб'ядноўвала сілы супраць агрэсіі крыжакоў, садзейнічала развіццю вытворчых і гандлёвых сувязяў паміж дзяржавамі. Разам з тым унія мела і адмоўны ўплыў на Вялікае Княства, бо садзейнічала экспансіі польскіх феадалаў на яго землі, прымусоваму акаталічванню насельніцтва.*

***Ключавыя словы:*** *Крэўская унія, Польскае каралеўства, Вялікае Княства Літоўскае, вялікі князь літоўскі, кароль Польшчы, праваслаўе, каталіцызм, крыжакі, вектары развіцця.*

**Уводзіны.** Беларускі гісторык М.І. Ермаловіч справядліва адзначыў, што “Крэўская унія мае глабальнае значэнне для ўсёй нашай гісторыі” [1, с. 219]. Сапраўды, Крэўская унія паклала пачатак новаму этапу ў развіцці дзяржаўных сувязей Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай – этапу персанальных уній, які доўжыўся амаль два стагоддзі, да Люблінскай уніі 1569 года. Крэўская унія разглядаецца ў значнай колькасці навуковых даследаванняў. Ніводзін даследчык гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы XIV стагоддзя ў сваіх працах не можа абыйсці ўвагай Крэўскую унію. Прычыны Крэўскай уніі, яе змест і наступствы разглядалі: М.І. Каяловіч, І.В. Турчыновіч, В.Ю. Ластоўскі, У.М. Ігнатоўскі, М.В. Доўнар-Запольскі, М.І. Ерамаловіч – *беларускія гісторыкі* [2]; Я.А. Юхо, Т.І. Доўнар, А.Ф. Вішнеўскі, І.М. Кузняцоў, В.А. Шэлкапляс – *гісторыкі права* [3]; Ю. Бардах, Б. Леснадорскі, М. Піетрчак, У. Грабеньскі – *польскія гісторыкі* [4]; Э. Гудавічус – *літоўскі гісторык* [5] і іншыя.

Разам з тым шмат якія праблемы Крэўскай уніі па-рознаму ацэньваюцца ў навуковых публікацыях. Таму аўтар (*І. Б.*) ставіць за мэту свайго артыкула *прааналізаваць* некаторыя, на яго погляд, найбольш значныя ацэнкі і тлумачэнні прычын, зместу і наступстваў Крэўскай уніі, у выніку *вырашыць* наступныя задачы:

- высветліць дзяржаўна-прававы статус Крэўскага дагавора 1385 года, яго прычыны і наступствы;
- прааналізаваць змяненні дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага і статуса вялікага князя па ўмовах уніі;
- каго хрысціў у каталіцкую веру Ягайла: язычнікаў ці язычнікаў і праваслаўных хрысціян?
- прааналізаваць магчымыя гістарычныя вектары развіцця Княства – заходні і ўсходні, прычыны выбару Ягайлам заходняга вектара;
- выказаць аўтарскі погляд на ацэнкі уніі ў сучаснай навуковай літаратуры.

Мэта даследавання – звярнуць увагу на сучасныя падыходы і ацэнкі прычын, характару і наступстваў Крэўскай уніі. Навуковая навізна артыкула ў тым, што зроблены захад палітыка-прававога аналізу летапісных дадзеных аб спробах надаць Літве статус каралеўства, паказаны прычыны выбару Ягайлам заходняга вектару развіцця Вялікага Княства.

**Асноўная частка.** Звернем увагу на *статус* Крэўскага дагавора 1385 года. У тэксце Акта Крэўскай уніі сказана, што ў яго абмеркаванні і зацвярджэнні прынялі ўдзел прадстаўнікі як Літвы, так і Польшчы. Польская дэлегацыя прадстаўляла інтарэсы “Альжбеты, каралевы Вугорскай, Польскай, Далмацкай і г. д.” [6, с. 32]. У яе склад уваходзілі ўплывовыя саноўнікі: “айцец Стэфан, пробашч Ханадзенскі, Уладзіслаў, сын Какаса дэ Каза, каштэлян з Патока, Влодка, падчашы Кракаўскі, Мікалай, каштэлян Завіхоскі і Крыстын, дзяржаўца Казімірскі” [6, с. 32, 33]. У склад літоўскай дэлегацыі ўваходзілі князі

літоўскія: Скіргайла, Карыбут, Вітаўт і Лігвен [6, с. 34]. Але ў тых складаных палітычных умовах, аб якіх мы яшчэ скажам ніжэй, кіруючыя колы Польшчы і Літвы адчувалі, што недастаткова толькі вузкім колам прадстаўнікоў польскай каралевы і вялікага князя літоўскага вырашыць вельмі адказнае пытанне дзяржаўнага саюза (уніі) паміж вялікімі дзяржавамі. Таму былі праведзены нарады: літоўскай і польскай знаці ў Вільні, асабліва важная прадстаўнічая нарада знаці праведзена ў Ваўкавыску (1386 г.). На гэтых нарадах былі выпрацаваны *ўмовы дзяржаўнага саюза Літвы і Польшчы*: агульны гаспадар – Ягайла, сумесная абарона дзяржаў, агульная дыпламатыя па справах, якія закранаюць супольныя інтарэсы абедзвюх дзяржаў. Разам з тым было адзначана, што мясцовае кіраванне ў Польшчы і Літве будзе асобным, кожная дзяржава будзе мець сваіх службовых асоб, асобныя фінансы і ўласныя войскі [7, с. 112].

Такім чынам, умовы Крэўскай уніі былі ўзгоднены прадстаўнічымі дэлегацыямі бакоў, гэта забяспечыла хуткае ўзвядзенне Ягайлы на польскі прастол. 14 жніўня 1385 года быў падпісаны Крэўскі акт, 12 лютага 1386 года Ягайла ўжо пераехаў у Кракаў, 15 лютага ён быў ахрышчаны па каталіцкаму абраду, 18 лютага 1386 года быў павянчаны з Ядвігай, а 4 сакавіка 1386 года быў каранаваны каралём Польшчы. Так быў пакладзены пачатак дзяржаўнаму саюзу (уніі) паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай, якому было наканавана доўжыцца амаль 400 гадоў, да падзелаў Рэчы Паспалітай і ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

Каб усвядоміць змест Акта Крэўскай уніі, неабходна разглядзець абставіны, якія ў тыя часы збліжалі Літву і Польшчу, а таксама перашкоды і цяжкасці на шляху ўсталявання дзяржаўнага саюза дзвюх краін. Беларускі гісторык У.М. Ігнатоўскі лічыў, што Крэўская унія "залежала не толькі ад надворных (знешніх – *І. Б.*), але і ад прычын хатніх" (унутраных – *І. Б.*) [8, с. 89]. У летапісу "Хроніка Быхаўца" адзначана, што ў бацькі Ягайлы – князя Альгерда было 12 сыноў. Ад першай жонкі Ганны ў Альгерда было 6 сыноў і ад другой жонкі Ульяны – таксама 6 сыноў; старэйшым быў Ягайла. У Альгерда быў родны брат Кейстут, які валодаў Трокамі і Жамойцкай зямлёй і таксама меў 6 сыноў; старэйшым быў Вітаўт [9, с. 98, 99].

Такім чынам, магчымымі спадкаемцамі вялікакняскага літоўскага пасаду маглі лічыць сябе ўсе 18 прэтэндэнтаў. Праблема і ў тым, што Ягайла быў ад другой жонкі Альгерда – Ульяны; але былі яшчэ 6 сыноў ад першай жонкі Ганны, якія лічылі, што маюць большыя правы на княскі трон, нават пры ўмове, калі Альгерд вылучыў на трон не іх, а Ягайлу.

Супярэчліва складаліся адносіны Ягайлы з Кейстутам, малодшым Альгердавым братам, сваім дзядзькам. Куйстут паважаў волю памершага свайго брата вялікага князя Альгерда, які перадаў трон Ягайле, праяўляў паслушэнства свайму пляменніку, прызнаў яго вялікім князем. Каб падтрымаць аўтарытэт Ягайлы, Кейстут нават ездзіў да яго ў Вільню на пасяджэнні вялікакняскай рады, як і раней ездзіў да свайго брата Альгерда. Але Ягайла баяўся папулярнасці свайго дзядзькі Кейстута, таму ён пайшоў на вераломства, каб пазбавіцца ад магчымага канкурэнта. З гэтай мэтай, як сведчыць "Летапіс вялікіх князёў літоўскіх", Ягайла запрасіў Кейстута з сынам Вітаўтам да сябе ў госці, дзе яны былі закаваны ў ланцугі і зняволены ў Крэўскім замку. "І там у Крэва ў пятую ноч, – сведчыць "Летапіс вялікіх князёў літоўскіх", – князя вялікага Кейстута задушылі каморнікі Ягайлы" [10, с. 54]. Не лепшая доля чакала і Вітаўта, які "сядзеў у Крэве пад моцнаю вартаю". Але Вітаўту дапамог выпадак: ён у жаночай вопратцы "спусціўся з замка і ўцёк да немцаў у Прусію" [10, с. 54]. Летапіс сведчыць, што ў Вітаўта былі асабістыя прычыны варожасці да Ягайлы. Такім чынам, улада Ягайлы з-за сваяцкіх міжусобіц у Вялікім Княстве Літоўскім не была моцнай і трывалай, таму ён аб'ектыўна імкнуўся шукаць сабе апоры, у тым ліку і за межамі Княства.

У 1382 годзе памёр польскі кароль Людовік, які адначасова быў і венгерскім каралём. Пасля яго смерці мужчын у каралеўскім родзе не засталося, таму спадчыну прынялі яго жонка і дзве дачкі – Марыля і Ядвіга. Людовік у свой час аддаў Марылю за Зыгмунда Брандэнбургскага і пакінуў яму ў спадчыну польскі каралеўскі пасад. Але немцы не падабаліся польскім панам, яны не хацелі бачыць на каралеўскім троне Зыгмунда. Два гады цягнулася бескаралеўе, якое ўносіла бязладдзе ў Польскую дзяржаву. Патрэбна было знайсці выйсце з такога становішча і пакончыць з бязладдзем. Пасля доўгіх перамоў маці-каралева згадзілася аддаць польскі прастол малодшай незамужняй дачцэ Ядвізе. Кандыдатам у жаніхі Ядвізе польскія паны вызначылі Ягайлу, які, па выразу Ігнатоўскага, быў "не столькі прыемным для яе, колькі карысным для Польшчы" [8, с. 88].

Склаліся і іншыя цяжкасці і перашкоды пры заключэнні Крэўскай уніі, якія маглі істотна паўплываць на яе змест. З летапісных крыніц вядома, што шлюб шмат у чым не ладзіўся, нават узрост маладых, нявесты Ядвігі і жаніха Ягайлы, выклікаў шмат пярэчанняў, асабліва з боку Ядвігі. Ягайле было 37 гадоў, Ядвізе, па розных крыніцах, – 12 ці 14 гадоў. Беларускі гісторык М. Ермаловіч зазначыў, што Ядвіга не хацела ісці за Ягайлу, нават спрабавала ў роспачы ад такога няроўнага шлюбу атруціцца [1, с. 221]. Тады за справу ўзяўся касцёл. Ядвіга дні і ночы малілася ў касцёле, яна прасіла ў Бога заступніцтва ад няроўнага шлюбу. Існуе легенда, што падчас слёзнай малітвы Ядвіга пачула "незямны" голас з вышынь

касцёла, які быццам заклікаў яе выйсці замуж за Ягайлу і гэтым садзейнічаць хрышчэнню Аўкштайтаў і Жмудзі, апошніх у Еўропе язычнікаў. Голас з вышынь касцёла Ядвіга ўспрыняла як боскую волю, таму шлюб з Ягайлам яна разглядала як вызначаную ёй богам місію [11].

Факт дзіўнага замужаства малалетняй Ядвігі з Ягайлам па-рознаму расцэньвалі ў Польшчы. Польскі пісьменнік Генрых Сенкевіч адзначаў, што Ядвіга ў Польшчы лічылася святой, бо яна адраклася ад дзявочага кахання і выйшла замуж за Ягайлу, толькі каб распаўсюдзіць каталіцкую веру на язычніцкую Літву. Папа Баніфацый IX называў Ядвігу "абранніцай" касцёла. Людзі верылі, што святая Ядвіга магла толькі дакрананнем сваёй рукі вылечыць хворага [12]. Была яшчэ адна перашкода – справа аб так званых "200 тысяч фларынаў". Ядвіга з сямі гадоў выхоўвалася пры венскім двары, была заручана з Вільгельмам з дынастыі Габсбургаў, якая правіла ў Аўстрыі. Габсбургі разлічвалі праз шлюб Вільгельма з Ядвігай атрымаць польскія землі. Пры заручынах Ядвігі і Вільгельма бацькі заключылі дагавор: дом Вільгельма дае маладым 200 тыс. фларынаў; калі ж Ядвіга па нейкім прычынам не зможа выйсці замуж за Вільгельма, у гэтым выпадку яму сям'я Ядвігі павінна выплаціць 200 тыс. фларынаў у якасці адкупнога. Ядвіга парушыла дамоўленасць і не выйшла замуж за Вільгельма, таму, згодна дамоўленасці, павінна выплаціць яму адкупныя 200 тыс. фларынаў, аб чым было і запісана ў Акце Крэўскай уніі [7, с. 113]. У тэксце уніі не сказана, пра які фларын ідзе размова, бо ў той час існавалі залаты і срэбраны фларын. Выкажым меркаванне, што меўся на ўвазе менавіта залаты фларын, бо здзелкі паміж дзяржавамі заключаліся, як правіла, па вышэйшаму стандарту – залатой манеце. Наша меркаванне пацвярджаецца і некаторымі іншымі крыніцамі, якія называюць фларыны чырвонцамі [7, с. 113]. У тыя часы чырвонцамі называлі замежныя залатыя манеты. Залаты фларын меў 3,53 грамы золата [13]. У гэтым выпадку сума адкупнога была велізарнай – 706 кілаграмаў золата; як слушна зазначыў прафесар Я. Юхо, за такія грошы ў той час можна было купіць цэлую дзяржаву [14, с. 84].

Меліся і іншыя прычыны, якія вымагалі дзяржаўны саюз паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай. "Аб'ектыўна саюз паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай быў выгадны абедзвюм дзяржавам і ўсім народам Усходняй Еўропы, – адзначае прафесар Я.А. Юхо, – бо дазваляў аб'яднаць сілы супраць нямецкай і татарскай агрэсіі. Гэты саюз быў карысным таксама і для развіцця вытворчых сіл, гандлёвых сувязей" [14, с. 82]. Напрыклад, М.І. Ермаловіч не лічыў галоўнымі прычынамі Крэўскай уніі ні крыжакоў, ні слабасць улады Ягайлы [1, с. 219, 220]. Галоўная прычына уніі, на яго думку, у тым, што Польшча страціла заходнія землі – Сілезію і Памеранію. Крэўская унія давала магчымасць кампенсаваць страты заходніх тэрыторый за кошт усходніх – зямель Вялікага Княства Літоўскага, пры гэтым польскія вярхі "адкінулі меч, замяніўшы яго уніяй" [1, с. 221].

Даследчыкаў і сёння здзіўляюць і ўмовы Крэўскай уніі ў той рэдакцыі, у якой яны дайшлі да нас. У Акце Крэўскага дагавора адзначана, што Ягайла за права шлюбу з Ядвігай "прагне прыняць веру каталіцкую святога рымскага Касцёла", ён перадасць "увесь свой скарб для вяртання страт, якія панеслі як Польшча так і Літва", абавязуецца "вярнуць каралеўству Польскаму ўсе краі, кім бы яны ад яго не (былі) адарваны і забраны". "Нарэшце, – запісана ў Акце уніі, – той жа вялікі князь Ягайла абяцае землі свае літоўскія і рускія на вечныя часы да Кароны каралеўства Польскага далучыць" [6, с. 33, 34].

Сапраўды, як адзначаюць многія даследчыкі, умовы Крэўскай уніі больш падобныя на акт капітуляцыі мацнейшай Літвы перад слабейшай Польшчай, чым на дзяржаўны саюз дзвюх дзяржаў. У летапісу "Хроніка Быхаўца" запісана, што ў 1384 годзе, напярэдадні уніі, "Князь Ягайла землю Ляшскую спустошыў і плёну шмат забраў – золата, і срэбра, і камення дарагога – і, невымоўнага скарбу набраўшы, у цэласці прыйшоў да стальца свайго – да Вільні" [9, с. 104]. Больш таго, Ягайла не задаволіўся толькі польскімі скарбамі, ён пашырыў тэрыторыю Княства за кошт польскіх зямель. У "Хроніцы Быхаўца" адзначана, што "Ягайла правёў мяжу з ляхамі па Белай Вадзе, гэта значыць па рацэ Вісле" [9, с. 105].

Як жа тлумачаць даследчыкі гэты неверагодны летапісны факт, калі мацнейшая Літва нібыта дабраахвотна абяцала перадаць свае землі і казну слабейшай Польшы, над якой толькі што атрымала бліскучую ваенную перамогу? Справа ў тым, што арыгінал тэкста Крэўскай уніі да нас не дайшоў, мы маем толькі яго копію без рэквізітаў – неабходных подпісаў і пячатак. Таму, на погляд прафесара Я.А. Юхо, магчыма, тэкст Крэўскага пагаднення пазней быў сфальсіфікаваны складальнікамі хронік або зменены польскімі феадаламі з прапагандысцкімі мэтамі, пры гэтым, магчыма, "падроблены быў не ўвесь акт, а толькі асобныя месцы" [14, с. 85]. Сапраўды, акт Крэўскай уніі стаў вядомым толькі пасля смерці Ягайлы, з хронікі Яна Длугаша. Прадстаўнікі Вялікага Княства Літоўскага шмат раз заяўлялі аб няпраўдзівасці польскіх хранікёраў. Так, на Люблінскім сойме 1569 года паслы Вялікага Княства Літоўскага аспрэчвалі тэкст Крэўскага пагаднення, яны заяўлялі, што гэтыя запісы наогул не існавалі. Вядомы нам тэкст уніі захоўваўся не ў дзяржаўнай канцылярыі, дзе па тагачасным правілам захоўваліся ўсе дзяржаўна-прававыя акты, а ў архіве кракаўскай капітулы [14, с. 85].

З тэксту Крэўскага пагаднення даследчыкі робяць супярэчлівыя вывады аб характары і змесце дзяржаўных сувязяў паміж Вялікім Княствам і Польшчай. Некаторыя даследчыкі ставяць пад сумненне – ці мела Вялікае Княства ў тыя часы сваю дзяржаўнасць? Літоўскі прафесар Э. Гудавічус сцвярджае, што ў тыя часы ў Літве не было паняцця дзяржавы, бо ў Крэўскай уніі было запісана аб каралеўстве Польскім і аб землях Літвы і Русі. "Пагэтаму Крэўскі дагавор, – адзначае Э. Гудавічус, – фактычна заключылі польская дзяржава і князь Літоўскі" [5, с. 167]. Для падмацавання сваёй думкі Гудавічус спасылаецца на тое, што ў Княстве не было дзяржаўных "інстанцый", нават дзяржаўнай канцылярыі, таму канцылярыі польскага караля прышлося "абслугоўваць і літоўскае справаводства" [5, с. 167]. Адсутнасць у Княстве дзяржаўных "інстанцый", на погляд Гудавічуса, прывяло "к встраиванию литовцев в польские государственные инстанции", гэта перашкаджала ўзнікненню адпаведных дзяржаўных устаноў у самой Літве. "Інакш кажучы, – зазначае Э. Гудавічус, – Літва пераўтваралася ў правінцыю" [5, с. 167]. На наш погляд, разважанні прафесара Э. Гудавічуса шмат у чым скажаюць відавочныя гістарычныя факты. Навукова абгрунтавана, што на тэрыторыі Беларусі першыя дзяржаўныя ўтварэнні існавалі задоўга да Крэўскай уніі, яны меліся ўжо ў XI–XIII стагоддзях у выглядзе княстваў – Полацкага, Тураўскага, Мінскага, Гродзенскага, Навагрудскага і інш. Далейшае развіццё беларуская дзяржаўнасць атрымала ўжо ў Вялікім княстве Літоўскім.

Што датычыцца тэкста Крэўскай уніі, у якой упамінаецца не "дзяржава", а "землі літоўскія і рускія", то яшчэ прафесар Я.А. Юхо звярнуў увагу, што ў старадаўнасці для вызначэння дзяржавы існавалі некалькі тэрмінаў. У летапісах і іншых пісьмовых крыніцах дзяржавы называюцца такімі тэрмінамі, як "зямля", "горад", "княства", "воласць". Праўда, гэтыя паняцці мелі некаторыя адценні. Тэрміны "княжэнне" і "княства" больш падкрэслівалі ўладныя паўнамоцтвы, а тэрмін "зямля", "горад" – тэрыторыю дзяржавы і яе дзяржаўную будову. "У склад "землі"", – адзначае прафесар Я.А. Юхо, – як правіла, уваходзілі некалькі больш дробных княстваў, г. зн. "зямля" выступае як злучаная феадальная дзяржава" [14, с. 58, 59].

Адносна *дзяржаўнай канцылярыі Княства*, то сапраўды гэтая ўстанова з'явілася ў Вялікім Княстве Літоўскім пазней уніі, пры Вітаўту, як і некаторыя іншыя "інстанцыі" (установы дзяржаўнага апарату). Але ў дадзеным выпадку размова ідзе не аб вызначальных рысах беларуска-літоўскай дзяржаўнасці, а аб эвалюцыйным працэсе станаўлення і развіцця дзяржаўнага апарату, які ў Княстве, як і ў любой еўрапейскай дзяржаве, заняў значны час.

Супярэчліва, па ўмовах Крэўскай уніі, даследчыкі вызначаюць характар міждзяржаўных адносін Вялікага Княства з Польшчай. "Уз'яднанне азначала сюзарэнітэт Польскага каралеўства над Вялікім Княствам Літоўскім, – сцвярджае прафесар Э. Гудавічус, – ці знешні васалітэт апошняга" [5, с. 166]. Але і тут ў прафесара Гудавічуса відавочныя нестыкоўкі і супярэчнасці. Сюзерэн у сярэднявеччы разумеўся як буйны феадал – вярхоўны сеньёр тэрыторыі; кароль, які з'яўляўся гасударом у адносінах да залежных ад яго васалаў. Ягайла не страціў Вялікага Княства, бо ў Акце Крэўскай уніі няма ніякіх абмяжаванняў вотчынных правоў Ягайлы на Княства. Выхад з тупіковай сітуацыі прафесар Гудавічус знаходзіць у наступным: "Ягайла, які аб'яднаў на аснове персанальнай уніі абоі прастолы, стаў у якасці вялікага князя Літоўскага васалам сябе самога – як караля Польшчы" [5, с. 166].

На наш погляд, больш пераканаўчая па гэтай праблеме пазіцыя М.В. Доўнар-Запольскага, які лічыў, што "Ягайла не быў настолькі моцным у самой Літве гасударом, каб мог далучыць Літву да Кароны. Таму яму неадкладна давялося пайсці на ўступкі" [15, с. 87]. Але і падчас вымушаных уступкаў Ягайла імкнуўся падкрэсліць свой статус вялікага князя (гаспадара) Літвы. Перад ад'ездам у Кракаў Ягайла пакінуў сваім намеснікам у Княстве свайго брата Скіргайлу. Але Ягайла пазбавіў яго Вільні, якую аддаў у кіраванне паляка Клімента Маскажэўскага. Сваёй рэзідэнцый Скіргайлу прышлося абраць не Вільню, а Трокі, што ў вачах тагачаснай знаці прыніжала ўладу Скіргайлы.

Аб тым, што пасля Крэўскай уніі Літва не стала васалам Польшчы, яскрава сведчыць справа аб выплаце 200 тыс. фларынаў адкупнога за Ядвігу. Як адзначае М.І. Каяловіч, Ядвіга захавала да свайго былога жаніха старую прыхільнасць, таму клапацілася, каб гэтыя грошы яму былі выплачаны. У 1398 годзе Ядвіга напомніла аб доўгу Вітаўту як вялікаму князю Літвы, з якой павінны былі быць сабраны патрэбныя адкупныя грошы. Вітаўт склікаў у Луцку сойм, на якім з абурэннем аб'явіў аб гэтым зняважальным для Літвы патрабаванні, пры гэтым ён заявіў: "Мы не рабы Польшчы; продкі нашы ніколі не плацілі даніну. Мы людзі свабодныя і нашаю кроў'ю набылі гэтую зямлю" [7, с. 121]. У такім тоне быў пасланы і адказ Ядвізе, што прывяло яе ў нямалы гнеў, але грошы засталіся не выплачанымі. У 1392 годзе Вітаўт атрымаў ад Ягайлы ўладу над Літвой, а на з'ездзе, які адбыўся на востраве Салін (1398 г.), ён быў абвешчаны самастойным правіцелем Літвы [16, с. 123]. У святле гэтых фактаў сцвярджаць аб васальнай залежнасці Літвы ад Польшчы няма абгрунтаваных падстаў.

Беларускі гісторык У.М. Ігнатоўскі разглядаў умовы Крэўскай уніі з двух бакоў: з юрыдычнага і фактычнага. “Юрыдычна, паводле тэксту дагавора, унія 1386 года была больш, чым дынастыйна-персанальнаю, – адзначыў Ігнатоўскі. – Яна была як бы інкарпарацыяй дзяржавы Літоўска-Беларускай у каралеўства Польскае” [8, с. 89]. Сапраўды, у Акце Крэўскай уніі, як мы ўжо адзначалі, запісана, што “вялікі князь Ягайла абяцае землі літоўскія і рускія на вечныя часы да Кароны Каралеўства Польскага далучыць” [6, с. 34]. Азначаная норма ўніі павінна была пазбавіць Вялікае Княства Літоўскае незалежнасці, бо яго землі далучаліся да Польшчы і разам з Польшчай станавіліся адным палітычным і дзяржаўным механізмам. “Але фактычна далёка не заўсёды бывае тое, што пішацца ў юрыдычных актах, – справядліва зазначыў Ігнатоўскі. – Так было і тут. Унія была зроблена больш на паперы, чым у жыцці” [8, с. 90]. У гэтым сэнсе можна пагадзіцца з Доўнар-Запольскім, які Акт Крэўскай уніі, як і некаторыя наступныя акты стагоддзя называў “мёртванароджанымі” [15, с. 87]. Сапраўды, мы маем гістарычныя сведчанні, што толькі дзве нормы Акта Крэўскай уніі былі рэалізаваны на практыцы: Ягайла ажаніўся на Ядвізе і стаў каралём Польшчы, ён прыняў каталіцкую веру і актыўна распаўсюджваў яе ў Вялікім Княстве. Але застаецца неабвержаным фактам, што Вялікае Княства Літоўскае больш двух стагоддзяў пасля Крэўскай уніі жыло сваім жыццём і самастойнасць сваю не згубіла. Ігнатоўскі справядліва зазначыў, што Вітаўт як вялікі князь літоўскі ў 1392–1430 гг. кіраваў дзяржавай “зусім незалежна ад Ягайлы, караля польскага” [8, с. 90]. Погляд У.М. Ігнатоўскага пацвярджаецца гістарычнымі фактамі. У 1380 годзе Ягайла, па вызначэнні І.В. Турчыновіча, “легкомысленно” аддаў Полацкае княства свайму брату Скіргайлу. Але палачане не прынялі Скіргайлу, “посадив его на старую клячу, с бесчестием” выправадзілі яго з горада, “взяв с него клятву никогда не возвращаться более” [17, с. 108].

Змяніўся і статус Ягайлы пасля атрымання ім пасады караля. “У Польшчы Ягайла быў не толькі кароль, але і прызнаны Еўропай манарх, – адзначыў прафесар Э. Гудавічус, – а ў Літве ён быў для Еўропы – ніхто” [5, с. 168]. Сапраўды, па сярэдневяковым традыцыям улада караля была вышэй княскай улады. Нагадаем запіс у “Летапісу вялікіх князёў літоўскіх” аб спробе Вітаўта атрымаць тытул караля. Летапіс адзначе, што па традыцыі таго часу Вітаўт павінен атрымаць карону, дарованную рымска-германскім імператарам і асвечаную папай, а таксама яго ў новым тытуле павінны былі прызнаць іншаземныя дзяржавы. У гэтых мэтах у 1430 годзе Вітаўт запрасіў да сябе караля польскага Ягайлу, вялікага князя маскоўскага Васіля, вялікага князя цверскага Барыса, магістра нямецкага і прускага, магістра лівонскага і іншых. Да Вітаўта прыехалі паслы ад цара царградскага, рымскага цэсара, дацкага караля, князя разанскага, ад Вялікага Ноўгарада і Пскова, ад ардынскага цара і “ад іншых князёў і земляў пасла былі” [10, с. 65]. Мы свядома пералічылі летапісныя звесткі аб прысутных на з’ездзе 1430 года асобах, каб паказаць шырокі прадстаўнічы характар каранацыйнага з’езда. “Гэтыя каралі, вялікія князі і пасла былі ў вялікага князя Вітаўта сем тыдняў на яго страве, – сведчыць летапіс, – а на дзень ішло аброку па 300 бочак мёду, па 300 ялавіц, баранаў і вепраў па 300” [10, с. 65]. Для Вітаўта і яго жонкі загадзя ў Германіі заказалі дзве кароны, якія асвяціў папа рымскі. У Рым за каронамі было накіравана спецыяльнае пасольства Княства. Польскія феадалы разумелі, калі Вялікае Княства Літоўскае атрымае статус каралеўства, у такім выпадку яно стане незалежным ад Польшчы. “Князь вялікі Вітаўт хацеў ускласці на сябе карону, але яго непрыяцелі ляхі не прапусцілі яе, – адзначае летапіс, – і таму ён не ўсклаў на сябе карону” [10, с. 65], ад чаго князь Вітаўт моцна захварэў і неўзабаве памёр. Прыведзеныя летапісныя звесткі сведчаць, наколькі складаным і матэрыяльна затратным быў працэс атрымання каралеўскага тытула, які, як у выпадку з Вітаўтам, закончыўся трагічна.

У Акце Крэўскай уніі было запісана, што “Вялікі князь Ягайла з усімі братамі, яшчэ не ахрышчонымі, а таксама з крэўнымі, са шляхтай, зямянамі большымі і меншымі”, жадаюць прыняць каталіцкую веру [6, с. 33]. Каталіцкую веру прынялі не толькі Ягайла са сваімі братамі, але і дынастыя Ягелонаў, якая правіла з 1377 па 1572 год, да апошняга па мужчынскай лініі Ягелонаў – Жыгімонта II Аўгуста.

У гісторыкаў назіраюцца розныя тлумачэнні на конт таго, каго хрысціў Ягайла ў каталіцкую веру – толькі язычнікаў ці язычнікаў і праваслаўных хрысціян? У Акце Крэўскай уніі, як ужо адзначалася, было запісана, што Ягайла “прагне прыняць веру каталіцкую” з сваімі братамі, са шляхтай “яшчэ не ахрышчонымі” [6, с. 33]. Ключавое тут слова “*яшчэ не ахрышчонымі*”, якое можна тлумачыць па-рознаму: толькі язычнікі? Ці і праваслаўныя хрысціяне “не ахрышчоныя” ў каталіцкую веру? Як сцвярджае М.І. Каяловіч, у той час хрысцілі толькі язычнікаў, а “рускіх праваслаўных не чапалі” [7, с. 15]. Аднак М.І. Ермаловіч удакладняе, што язычнікі хрысціліся ў новую веру не адзіналічна, а калектыўна, групамі. “Для хрышчэння язычнікаў у Вільні сабралі каля ракі Вяллі, – піша Ермаловіч, – іх дзялілі на групы (асобна мужчын і асобна жанчын), святары акрапілялі іх свянцонай вадой і чыталі ім малітвы, а пасля цэлым групам давалі якое-небудзь каталіцкае імя” [1, с. 28]. Хрышчэнне адбывалася масава, па звестках Ермаловіча, толькі ў Вільні і Троках было ахрышчана каля 30 тысяч язычнікаў [1, с. 228]. Для заахвочвання да хрышчэння,

а таксама для адрознення хрышчоных ад нехрышчоных з Польшчы былі прывезены белыя світкі, якія раздаваліся хрышчоным. "Вельмі магчыма, – адзначаў М.І. Каяловіч, – што пры гэтым іншыя хрысціліся два разы, каб атрымаць дзве світкі" [7, с. 115]. Праваслаўны Вітаўт перайшоў у касцёл пасля таго, як атрымаў ад Ягайлы Бярэсце і Гародню [1, с. 223]. Гэтыя звесткі даюць падставу лічыць, што Ягайла да ліку "не хрышчоных" адносіў не толькі язычнікаў, але асабіста сябе і сваіх братоў, гэта значыць праваслаўных. Таму, на наш погляд, няма дастатковых падстаў сцвярджаць, што Крэўская ўнія скіравана была толькі на хрышчэнне літоўскіх язычнікаў. Праваслаўны Ягайла і яго праваслаўныя браты паказалі прыклад – сталі "ахрышчанымі католікамі".

На думку прафесара Э. Гудавічуса, "Літву ахрысціла не Польшча, Літва хрысцілася сама" [5, с. 171]: спярша хрышчэнне прыняла шляхта, а затым у ваколіцах адміністрацыйных цэнтраў (замкаў і двароў) хрысціліся сяляне. У 1387 годзе быў пабудаваны каменны кафедральны каталіцкі сабор у Вільні. Першыя каталіцкія прыходы былі арганізаваны ў Віленскім і Віцебскім княствах, якія належалі Ягайле. "Прыблізна за год у Літве было ўведзена каталіцкае веравызнанне, створана і матэрыяльна забяспечана дзеяздольная царкоўная арганізацыя, – сцвярджае Э. Гудавічус. – Вялікае Княства Літоўскае афіцыйна стала хрысціянскай краінай. Канфесійнае адставанне ад Еўропы было пераадолена" [5, с. 172].

Некаторыя даследчыкі выказваюць меркаванне, што народы Літвы зусім "не прагнулі" і "не хацелі" прыймаць каталіцкую веру, як аб гэтым сказана ў Акце Крэўскай уніі. Прафесар Каяловіч справядліва адзначаў, што лацінскае духавенства ў Літве спачатку складалася з палякаў, бо на той час яшчэ не было літоўскіх каталіцкіх святароў [7, с. 115, 116]. Утвораныя каталіцкія біскупствы на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага былі падпарадкаваны не непасрэдна Рыму, яны былі ўключаны ў склад польскай Гнезенскай царкоўнай правінцыі з падпарадкаваннем новых біскупаў польскаму духавенству. У некаторых выпадках дзеля аховы каталіцкага духавенства і падтрымання парадку ў месцах, дзе праводзілася масавае акаталічванне насельніцтва, былі ўведзены ўзброеныя атрады салдат-католікаў, набраных у Польшчы. "Прымусовае акаталічванне, узмацненне феадальнай эксплуатацыі, а таксама парушэнне суверэннасці дзяржавы ўвядзеннем польскіх воінаў, – адзначаў прафесар Юхо, – абвастрылі незадавальненне насельніцтва, і яно са зброяй у руках выступіла супраць урада" [14, с. 86]. Урад Скіргайлы не мог сваімі сіламі справіцца з выступленнямі насельніцтва, таму ён скарыстаў дапамогу польскіх войск. У 1388 годзе ўрад Скіргайлы разам з польскімі войскамі падавіў выступленне насельніцтва Віцебскай і Полацкай земляў, але і пасля гэтага выступленні і напады на польскія войскі не спыняліся па ўсёй Беларусі і Літве [14, с. 86].

У 1387 годзе Ягайла выдаў прывілеі, якімі надзяліў каталіцкія касцёлы землямі, вызваліў землі каталіцкіх прыходаў ад павіннасцей, падаткаў і плацяжоў, забараніў шлюб католікам з праваслаўнымі, а ў змешаных сем'ях прадпісвалася апошнім прыняць каталіцтва. У прывілеі Ягайлы ад 20 лютага 1387 года адзначалася, быццам "літоўскі народ" выказвае "шчырае і свабоднае імкненне … ў прыняцці хрышчэння ў праваую каталіцкую веру" [18, с. 39]. "Свабоднае імкненне" да каталіцкай веры ў прывілеі Ягайлы падмацоўвалася жорсткімі прымусовымі мерамі. "Кожны рыцар або баярын, які прыме каталіцкую веру, – адзначалася ў прывілеі, – і яго наступнікі, законныя нашчадкі, маюць і будуць мець поўную і ўсякую магчымасць валодаць, трымаць, карыстацца, прадаваць, адчужаць, абменьваць, даваць, дарыць, паводле сваёй добрай волі і думкі замкі, воласці, вёскі і дамы і ўсё, чым уладаў бы па бацькоўскай спадчыне" [18, с. 39]. Узнікае пытанне: а калі рыцар ці баярын не пажадае здрадзіць праваслаўю і не пяройдзе ў каталіцкую веру? А "хто будзе адмаўляцца прыняць яе (каталіцкую веру – *І. Б.*), – запісана ў прывілеі Ягайлы, – не павінен карыстацца ніякімі вызначанымі правамі" [18, с. 40]. Атрымоўвалася, дзеці праваслаўнага шляхціча, які не пажадаў прыняць каталіцкую веру, паводле прывілея, не атрымаюць па спадчыне бацькоўскую маёмасць, інакш кажучы, яны астануцца ні с чым, пераўтворацца ў жабракоў. Супаставім даты дакументаў: акт Крэўскай уніі быў падпісаны 14 жніўня 1385 года, а менш чым праз два гады, 20 лютага 1387 года, прывілей Ягайлы прадпісваў усёй шляхце перайсці ў каталіцкую веру пад пагрозай страты ўласнасці – асноўнай крыніцы іх існавання і багацця. Прыведзеныя нормы прывілея Ягайлы дакументальна пацвярджаюць, што Ягайла хрысціў не толькі язычнікаў, але прымусовымі метадамі акаталічваў і праваслаўных.

Для Літвы і Польшчы ў XIV стагоддзі мелася яшчэ адна смяртэльная небяспека – Нямецкі (Тэўтонскі) крыжацкі ордэн. Войны ордэна супраць Літвы пачаліся з 1283 года і цягнуліся бесперапынна. Дробныя наезды невялікіх атрадаў крыжакоў, засады перамяжоўваліся больш буйнымі паходамі. Крыжацкія атрады налічвалі ад некалькіх дзесяткаў да некалькіх тысяч воінаў, паходы цягнуліся ад некалькіх дзён да некалькіх тыдняў. У 1284–1328 гады крыжакі сем разоў нападалі на Гродна, аб'ектамі іх нападаў былі і іншыя населеныя пункты. Летапісы адзначаюць, што не было года, каб не адбыўся крыжацкі паход. Пасля замірэння ордэна з Польшчай у 1343 годзе агрэсіўнасць крыжакоў супраць Вялікага Княства Літоўскага значна вырасла, павялічылся маштабы іх паходаў. Разбойніцкія напады на Вялікае Княства Тэўтонскі ордэн апраўдваў быццам ускладзенай на ордэн місіяй – хрышчэння язычнікаў Літвы, далучэння іх да Рымскага касцёла.

Каб выбіць з пад ног крыжакоў падставу для іх паходаў на Вялікае Княства, патрэбна было ўладам Літвы правесці *хрышчэнне* яе язычаскага насельніцтва. Менавіта гэтымі абставінамі некаторыя даследчыкі тлумачаць нормы Крэўскага дагавору і захады Ягайлы па хрышчэнню Літвы. На погляд некаторых даследчыкаў, Крэўская ўнія выбівала падставы для самога існавання Тэўтонскага ордэна, бо хрышчэнне язычнікаў Літвы павінна адбыцца не мячом крыжаносцаў, а літоўскімі ўладамі па ўмовах уніі. Каб адстаяць сваё манапольнае права на хрышчэнне Літвы, крыжаносцы прыклалі намаганні на зрыў Крэўскага пагаднення і яго галоўнага пункта – шлюбу Ягайлы з Ядвігай. Было вырашана скарыстаць аўтарытэт главы касцёла – рымскага папы. Крыжаносцы ў Рыме ўзбудзілі хадайніцтва прызнаць шлюб Ядвігі з Ягайлам "незаконным", бо шлюб парушаў нібыта "царкоўныя правілы" на той падставе, што раней Ядвіга была ўжо заручана з Вільгельмам Аўстрыйскім. Папа рымскі прызначыў спецыяльную камісію для вывучэння пытання. Але ўсё абышлося, папская Камісія прызнала шлюб Ядвігі з Ягайлай законным, які адпавядаў царкоўным правілам [19, с. 124]. Яшчэ далей пайшоў папа рымскі Урбан VI, які ў сваёй буле ад 19 красавіка 1389 года прызнаў не толькі хрышчэнне Літвы, але і назваў Літву каталіцкай краінай [5, с. 172]. Здавалася, Нямецкі ордэн страціў нават фармальныя падставы для сваіх паходаў на Літву для яе быццам каталіцкага "хрышчэння". Але і пасля булы рымскага папы крыжакі не адмовіліся ад сваіх разбойніцкіх набегаў на літоўскія землі. Ордэн не прызнаў хрышчэння Літвы намаганнямі Ягайлы, абвясціў такое хрышчэнне паказным і несапраўдным [5, с. 172]. Дакументы сведчаць, што ў 1390, 1391, 1392 і 1394 гадах зноў адбыліся буйныя паходы крыжакоў на Вялікае Княства Літоўскае, апроч іх штогод адбывалася па некалькі дробных крыжацкіх нападаў. У сувязі з тым, што рэлігійныя падставы паходаў Ордэна на Літву зніклі з часу яе хрышчэння па ўмовах Крэўскага дагавора 1385 года, рымскі папа Баніфацый IX булай ад 9 верасня 1403 года забараніў крыжацкія паходы супраць Вялікага Княства Літоўскага. Але фактычна крыжацкія паходы скончыліся толькі пасля перамогі аб'яднаных літоўскіх і польскіх войск над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве 1410 года.

Супярэчліва *ацэньваецца* Крэўская унія ў навуковай літаратуры. Некаторыя даследчыкі засяроджваюць увагу толькі на яе станоўчых выніках. Польскі гісторык, акадэмік В. Грабеньскі, адзначае, што Крэўская унія "сыграла важную ролю і для Ягайлы, і для малапольскіх паноў", бо яна ўтрымлівала ідэю "пад'ёму літоўска-рускага насельніцтва да вялікасці заходняй цывілізацыі" [19, с. 119].

Прафесар А. Грыцкевіч звяртае ўвагу на тое, што дзякуючы Крэўскай уніі ўдалося ліквідаваць пагрозу з боку Тэўтонскага Ордэна, перамагчы яго ў Грунвальдскай бітве 1410 года, адкрыць гандлёвыя новыя шляхі, а таксама культурнае збліжэнне з іншымі краінамі Еўропы [20]. Станоўча ацэньваюць вы-нікі Крэўскай уніі прафесар А.Ф. Вішнеўскі [21, с. 56] і прафесар Т.І. Доўнар [22, с. 57].

Польскія гісторыкі Ю. Бардах, Б. Леснадорскі, М. Піетрчак таксама разглядаюць Крэўскую унію як спробу ўзмоцніць польска-літоўскі блок супраць Нямецкага ордэна, а таксама каб аблегчыць літоўскім панам захаваць сваё панаванне над праваслаўным насельніцтвам, якое складала большасць у Вялікім Княстве [16, с. 123].

Некаторыя даследчыкі імкнуцца ў сваіх працах надаць Крэўскай уніі больш узважаную ацэнку, адзначыць як станоўчыя, так і адмоўныя яе бакі.

Прафесар Я.А. Юхо адзначае, што Крэўская ўнія дала пачатак трываламу саюзу абедзвюх дзяржаў, садзейнічала барацьбе супраць анямечвання, разам з Віленска-Радамскай уніяй 1401 года адыграла важную ролю ў разгроме войск Тэўтонскага ордэна ў Грунвальдскай бітве 1410 года. Але, з другога боку, прафесар Юхо ацэньвае ўмовы Крэўскай уніі "несуразнымі і кабальнымі" [14, с. 84], бо унія садзейнічала прымусоваму акаталічванню насельніцтва Вялікага Княства, узмацненню феадальнага прыгнёту [23].

Насцярожана да ўмоў Крэўскай уніі адносіцца і М.І. Ермаловіч: "Хаця знешне Крэўская унія насіла характар персанальнай дынастыі, якой яе і лічаць даследчыкі, аднак маюць больш рацыю тыя, хто называе яе інкарпарацыяй Вялікага Княства Літоўскага ў Польскае каралеўства" [1, с. 223].

На наш погляд, у ацэнцы Крэўскай уніі некаторымі даследчыкамі з поля зроку выпускаецца яшчэ адна важная акалічнасць. Справа ў тым, што ў сярэдзіне 80-х гадоў XIV стагоддзя меліся *два варыянты* жаніцьбы Ягайлы – на польскай каралеве Ядвізе ці на дачцы Дзмітрыя Данскога. Інакш кажучы, перад Ягайлам меўся выбар *вектара гістарычнага развіцця Вялікага Княства*: *заходні* – польскі, ці *ўсходні* – маскоўскі.

Дзмітрый Іванавіч Данскі (1350–1389 гг.) – вялікі князь маскоўскі і ўладзімірскі, праваслаўны, у сваёй палітыцы абапіраўся на аўтарытэт і падтрымку Сергія Раданежскага. Менавіта ён першы з маскоўскіх князёў узначаліў барацьбу супраць татара-манголаў і перамог іх ў Кулікоўскай бітве, што і паклала пачатак вызваленню Русі ад татара-мангольскага панавання. За гэту бітву ён празваны Данскім (бітва адбылася каля ўпадзення ракі Няпрадвы ў Дон). Пры Дзмітрыі Данскім Масква замацавала кіруючае становішча ў рускіх землях. *Усходні*, маскоўскі, вектар развіцця таксама ўзмоцніў бы становішча Вялікага Княства і самога Ягайлы, дапамог бы пазбегнуць прымусовага акаталічвання насельніцтва, якое пасля

Крэўскай уніі шмат у чым нагадвала грамадзянскую вайну. Але Ягайла выбраў іншы варыянт, ён ажаніўся на Ядвізе і стаў каралём Польшчы.

Маюцца падставы сцвярджаць, што Ягайла свядома пазбягаў сувязяў з усходам – з Маскоўскім княствам. Нагадаем: у Кулікоўскай бітве Ягайла выступіў саюзнікам ардынскіх сіл на чале з Мамаем, хаця ў бітве супраць войска Дзмітрыя Данскога не ўдзельнічаў, бо да пачатку бітвы спазніўся, таму без бою вярнуўся назад у Літву. Не рэалізавалася і другая спроба ўсталявання дзяржаўных сувязей с маскоўскім княствам. Сын Дзмітрыя Данскога Васіль, вяртаючыся ад хана праз Малдавію і Валынь, заехаў у Луцк да Вітаўта. Тут ён пазнаёміўся з дачкою Вітаўта Софіяй, якая яму спадабалася і нават была з ім заручана. Ягайла варожа аднёсся да заручын, па сведчанні М.І. Каяловіча, паміж Вітаўтам і Ягайлам на гэтай глебе адбыліся “непрыемныя размовы”, узмоцнілася іх “старая варожасць” да такой ступені, што Вітаўт прымушаны быў у 1390 годзе кінуцца ва ўцёкі ў Прусію, да нямецкіх рыцараў [7, с. 117]. Перамог заходні вектар гістарычнага развіцця Вялікага Княства, які знайшоў сваё юрыдычнае замацаванне у Акце Крэўскай уніі 1385 года.

Такім чынам, у заключэнне праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя **высновы:**

- Крэўскай уніі належыць лёсавызначальнае значэнне для Беларусі, Літвы і Польшчы;
- па ўмовах уніі вялікі князь літоўскі Ягайла атрымаў польскі прастол, тым самым быў пакладзены пачатак у развіцці дзяржаўных сувязей Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага – перыяду персанальных уній, які доўжыўся да Люблінскай уніі 1569 года;
- аб’ектыўна унія была выгадна не толькі Вялікаму Княству Літоўскаму і Польшчы, але і народам Усходняй Еўропы, бо аб’ядноўвала сілы супраць агрэсіі крыжакоў, садзейнічала развіццю вытворчых сіл і гандлёвых сувязяў паміж дзяржавамі. Разам з тым Крэўская унія мела і адмоўны ўплыў на Вялікае Княства, бо садзейнічала польскай экспаніі на яго землі, прымусоваму акаталічванню насельніцтва, якое пасля Крэўскай уніі набыло рысы грамадзянскай вайны.

Асноўны вынік навуковага даследавання – рэалізаваны захад палітыка-прававога аналізу летапісных дадзеных аб спробах надаць Літве статус каралеўства.

ЛІТАРАТУРА


1. Ермаловіч, М. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае / М. Ермаловіч. – Мінск : Беллітфонд, 2000. – 448 с.
2. Коялович, М.И. Чтения по истории западной России / М.И. Коялович. – Минск : БелЭН, 2006; Турчинович, И.В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен / И.В. Турчинович. – Минск : БелЭН, 2006; Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі / В.Ю. Ластоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1992; Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У.М. Ігнатоўскі. – Мінск : Беларусь, 1992; Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. – Мінск : БелЭН, 1994; Ермаловіч М. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае / М. Ермаловіч. – Мінск : Беллітфонд, 2000.
3. Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я.А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992; Доўнар Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т.І. Доўнар. – Мінск: Амалфея, 2007; Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003; Кузнецов И.Н. История государства и права Беларуси / И.Н. Кузнецов, В.А. Шелкопляс. – Минск : Тесей, 2004.
4. Бардах Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Леснодорский, М. Пиетрчак. – М. : Юрид. лит., 1980; Грабеньский, Вл. История польского народа / Вл. Грабеньский. – М. : МФЦП, 2006.
5. Гудавичюс Э. История Литвы с древнейших времен до 1569 года / Э. Гудавичюс. Т. 1. – М. : Фонд имени И.Д. Сытина, BALRUS, 2005. – 679 с.
6. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах : Са старажытных часоў да нашых дзён : Акт Крэўскай уніі 1385 года / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – С. 32–34.
7. Коялович, М.И. Чтения по истории западной России / М.И. Коялович. – Минск : БелЭН, 2006. – 474 с.
8. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У.М. Ігнатоўскі. – Мінск : Беларусь, 1992. – 188 с.
9. Хроніка Быхаўца // Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – С. 69–166.
10. Летапіс вялікіх князёў Літоўскіх // Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1997. – С. 47–68.
11. Народная газета. – 1992. – 25 жніўня. – С. 3.
12. Сенкевич, Г. Крестоносцы / Г. Сенкевич. – М. : ЭКСМО, 2005. – С. 58, 59.
13. Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1993. – С. 630.

14. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я.А. Юхо. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 267 с.
15. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. – Мінск : БелЭН, 1994. – 509 с.
16. Бардах, Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Леснодорский, М. Пиетрчак. – М. : Юрид. лит., 1980. – 558 с.
17. Турчинович, И.В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен / И.В. Турчинович. – Минск : БелЭН, 2006. – 590 с.
18. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах : Са старажытных часоў да нашых дзён : Прывілей вялікага князя Літоўскага і караля Польскага Уладзіслава (Ягайлы). 20.02.1387 г. / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – С. 39–41.
19. Грабеньский, Вл. История польского народа / Вл. Грабеньский. – М. : МФЦП, 2006. – 572 с.
20. Грыцкевіч, А. Крэўская унія 1385 г. / А. Грыцкевіч // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 287.
21. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – 319 с.
22. Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т.І. Доўнар. – Мінск : Амалфея, 2007. – 400 с.
23. Юхо, І.А. Крэўская унія 1385 / І.А. Юхо // Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 : Тэксты. Давед. Камент. ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 496 с.

*Пастýпіў 06.02.2018*

**MODERN POLITICAL AND LEGAL ASSESSMENT OF KREVSK UNION 1385**

***I. BASIUK***

*It is noted that Krevsk union is of global importance in the history of the statehood of Belarus, it ushered in a new stage in the development of public relations of the Grand Duchy of Lithuania and Poland – stage personal dynastyk union, which lasted until the Union of Lublin in 1569. The political and legal analysis Krevsk Union is given, the causes and consequences of its conclusion are examined. The assessment of Belarusian, Polish and Lithuanian researchers of the legal status of the Grand Duke of union conditions are analyzed. two possible vector historical development Grand Duchy Lithuania are considered – southwest (Union Poland), and northeast (union with Moscow) shown circumstances selection Yahajlo Western vector development Principality. Crusaders shown inconsistency alleged religious motives of their trips to Lithuania. It is noted that Krevsk union objective was beneficial not only to the Grand Duchy of Lithuania and Poland, but also the peoples of Eastern Europe, as the united force against the Crusaders aggression contributed to the development of production and trade ties between the states. However, the union also had a negative effect on the Grand Duchy, as promoted the expansion of the Polish feudal lords on his land, forcibly stick a catholic faith of the population.*

***Keywords:*** *Krevo union, the Kingdom of Poland, Grand Duchy of Lithuania, Grand Duke of Lithuania, King of Poland, Orthodox Christianity, Catholicism, the Crusaders, the development of vectors.*